УДК 82.0

***Вячаслаў Мікалаевіч Смаль***
*канд. філал. навук, дац., дац. каф. спецыяльных педагагічных дысцыплін*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Viachaslau Smal***
*Candidate of Philological Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Special Pedagogical Disciplines*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: Smalslawa@mail.ru

# МАТЫЎ МАЛЕНЬКІХ ІСТОТ ЯК ЛІТАРАТУРНЫ ФЕНОМЕН І ЭЛЕМЕНТ АРХІТЭКТОНІКІ ТВОРАЎ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

*Разглядаецца прырода архетыпу маленькіх істот, яго выяўленне ў літаратуры розных эпох. Даследуецца матыў маленькіх істот (гномаў, фей, карлікаў, лялек) як аксіялагічная дамінанта міфалагічных і фальклорных тэкстаў сусветных (кельтскага, скандынаўскага, японскага) этнасаў, фенаменальны трэнд дзіцячай літаратуры, які ўплывае на жанрава-стылявую характарыстыку твораў для дзяцей.*

***Ключавыя словы:*** *дзіцячая літаратура, матыў маленькіх істот, міфалагічны вобраз, архетып, модус дыдактызму.*

## *The Motif of Small creatures as a Literary Phenomenon and the Architectural Element of Literary Works for Children*

*The article examines the nature of the archetype of small creatures, its manifestation in the literature of different eras. The motif of small creatures (gnomes, fairies, dwarfs, dolls) is investigated as an axiological dominant of mythological and folklore texts of world (Celtic, Scandinavian, Japanese) ethnic groups, a phenomenal trend in children's literature, which affects the genre and style characteristics of children's works.*

***Key words:*** *children's literature, motif of small creatures, mythological image, archetype, mode of didacticism.*

### Уводзіны

На сучасным этапе развіцця літаратуразнаўства выразна бачна неабходнасць не проста паглыбленага асэнсавання асобных твораў дзіцячай літаратуры, а менавіта дыяхранічны аналіз працэсу зараджэння мастацкіх палотнаў для дзяцей, спасціжэнне праблемы трансфармацыі асобных патэрнаў (англ. *pattern*) як паўтаральных шаблонных вобразаў і іх уплыву на чытача. У гэтым сэнсе важна разумець, што творы дзіцячай літаратуры ўяўляюць сабой у значнай ступені своеасаблівую камбінацыю літаратурных штампаў, паводле Дж. Г. Кавэлці, «дамову» («канвенцыю») між аўтарам і рэцыпіентам, што выяўлена найперш у топіцы і паэтыцы тэкстаў. Матыў маленькіх істот уяўляе сабой найбольш пашыраную канвенцыю, што праяўляецца на вобразным, жанравым, стылявым узроўнях мастацкіх тэкстаў для дзяцей.

### Міфалагічныя парадыгмы вобразаў маленькіх істот

Міф узнік у выніку пазнання чалавекам свету і спроб патлумачыць яго. Архаічнае міфамысленне трансфармавала і пераасэнсоўвала паўсядзённы вопыт і традыцыю, асобасную парадыгму і значныя сацыякультурныя вектары эпохі ў вобразах-міфах. У працы «Логіка міфа» Я. Э. Галасоўкер высунуў ідэю пра ўзнікненне міфа ў выніку чалавечай «імагінацыі» як працэсу творчых і пазнавальных уяўленняў [1]. Паводле вучонага, вышэйшым інстынктам чалавека з'яўляецца імагінатыўны абсалют, які пабуджае ствараць культуру, а міф і ёсць першафеномен культуры. Міф узнікае як вынік агульнакультурнага працэсу псіхалагічнай ідэнтыфікацыі індывіда з сімвалічна ўспрымаемымі з'явамі. Пакаленні індывідаў свядома і падсвядома трансфармавалі ўяўленні аб будучыні і народзе ў сімвалічных персаніфікацыях, міфалагічных вобразах. У архаічным грамадстве ва ўмовах адсутнасці рэлігіі ўяўленне пра ўстойлівасць падтрымлівалася табуізаванай сістэмай адносін да міфалагічных істот (частуй і не крыўдзі драбязу). Падобныя забаронныя імператывы былі адзначаны ірландскім даследчыкам Т. Кейтлі, аўтарам культавага даведніка пра гномаў, фей і эль-

фаў «Казкавая міфалогія» (1828), у адносінах да ўсіх класіфікуемых ім шматлікіх драбнюткіх міфалагічных істот (цірольскіх норгенаў, брытанскіх браўні і піксі, баскскіх іратсаакі, алеманскіх хютхенаў і ханцэлі, брэтонскіх карыганаў, карнуольскіх стуканцаў, кельтскіх эльфаў і інш.) з разнастайнымі характарамі (прыязных, удзячлівых, хітрых, помслівых, схільных да злых жартаў).

Паводле А. Бергсана, такія паводзінавыя стэрэатыпы выконвалі ў першабытнай агульнасці ахоўную функцыю і былі «перанесены са свету культуры ў свет прыроды з-за інстынктыўнай патрэбы самазахавання» [2, с. 32]. Позняе распаўсюджанне хрысціянства на літоўскіх землях, паводле даследаванняў Рымантаса Бальсіса, спрыяла ўстойлівасці культа частавання хатнікаў каўкасаў і падземных чалавекападобных барадачоў барздукаў, якія, паводле вераванняў літоўцаў, ахоўвалі ўраджай у полі [3].

Міф – своеасаблівы спосаб «канцэпіравання» акаляючай рэчаіснасці і тлумачэння асноўных працэсаў светаўспрымання і светаадчування, выяўлення легітымных мадэляў паводзін, уяўленняў, ключавых індыкатараў жыцця (статус, незалежнасць, здароўе, дабрабыт) старажытнага чалавека. Важнейшай сутнасцю міфа з'ўлялася арганічнае аб'яднанне ў ім канкрэтнага, рэальнага з абстрактным, звышнатуральным, ідэальным. У гэтым сэнсе слушным падаецца меркаванне С. А. Кашарнай, якая адзначае, што «міф – гэта адначасова і створанае фантазіяй, і спазнаная на практыцы рэальнасць, і выдумка, і праўда. Міфы мелі сакральны характар, былі цесна звязаны з рытуаламі і магічнымі дзеяннямі, мелі на мэце ўздзеянне на прыроду, і гэтая функцыя замацоўвалася за словам як прыладай магічнага ўздзеяння на навакольны свет» [4, с. 73].

Міф адлюстроўваў архаічнае мысленне і рэальнасць з пункту гледжання старажытнага чалавека, уяўляў сабой асаблівую кагнітыўную мадэль, парадыгму мыслення і прачытання рэчаіснасці. Украінскі даследчык сімвалізму фальклорных тэкстаў А. А. Пацябня падкрэсліваў: «Міф падобны да навукі, бо створаны імкненнем да аб'ектыўнага пазнання свету» [5, с. 152]. На тлумачальную функцыю міфа звяртала ўвагу і расійская даследчыца Н. В. Шасцёркіна: «Фактычна міф выконваў тыя ж функцыі, што і сучасная навука, – у прымальных для яго тэрмінах (сімвалах) ён вытлумачваў існае і тым самым рэгуляваў быццё чалавека ў свеце» [6, с. 1].

Базавыя міфалагічныя праобразы з цягам часу трансфармаваліся ў фальклорныя архетыпы, у т. л. архетып маленькіх істот, надзеленых ведамі пра іншасвет, магічнымі навыкамі, аднак уразлівых з-за свайго фізічнага стану (знешне драбней за людзей). Яны займаліся пэўнай дзейнасцю (рудакопы, шахцёры, скарбнікі) і маглі кантактаваць з чалавекам. Большасць такіх шаблонных фальклорных персанажаў выяўлялі функцыянальна-ролевую амбівалентнасць. Напрыклад, маленькі нарвежскі хатнік Нісэ (літаральна «ахоўнік селішча») рабіў як добрыя, карысныя ўчынкі, так і мог быць непрадказальна свавольным, капрызным, абразіцца і навесці шкоду жывёлам і людзям. Іншы падобны персанаж – вадзянік-карлік з чырвоным каўпаком Нокен, з аднаго боку, мог быць крывадушным, хітрым, ліслівым, зачараваць музыкай і спевамі сваіх ахвяр, найчасцей немаўлят і цяжарных, з іншага боку, яго роля прагматычна-выхаваўчая: вучыць дзяцей быць таварыскімі, абярэжнымі, асцерагацца непрыемнасцей на вадзе. Іспана-партугальскія дуэндэ і трысго (грэмліны, сільфы, гобліны і гномы), якія, паводле павер'яў, займаліся шкодніцтвам, падманам, выкраданнем рэчаў, паступова з міфаў пераходзілі ў літаратуру. Так, злы карлік Маначьела з паўднёваітальянскай міфалогіі быў перанесены ў «Казку казак» Дж. Базіле.

Міфалагічныя гісторыі пра персанажаў-трыгсцераў былі прыкладам таго, як слабы ці маленькі перамагаў свайго ворага з дапамогай кемлівасці і дасціпнасці, у далейшым яны знайшлі свае трансфармацыі ў фальклорных (казкі пра амерыканскага негра Хітрага Джо, персанаж англійскіх казак Джон Палец) і анімацыйных (Нахальны баягуз Багз Бані, Том і Джэры, Джокер) вобразах.

Матыў перамогі маленькіх, кволых, нямоглых над фізічна дужэйшымі прысутны ў розных культурах, відавочна, з прычыны культурна-гістарычных кантактаў, агульнасці чалавечага ўспрымання, інтэрпрэтацыі і адлюстравання разнаітага акаляючага свету, сістэмы каштоўнасцей і светапоглядных арыенціраў. Ён быў прывабны, безумоўна, як антаганізм існуючай рэчаіснасці, яе недасканаласці і несправядлівасці.

Паступова з міфаў не ў рамках звязнага сюжэта вобразы маленькіх істот пачалі пранікаць у пісьмовыя помнікі. Так, ужо ў старажытнаегіпецкіх тэкстах ІІІ тысячагоддзя да н. э. згадваецца асобая раса афрыканскіх карлікаў – пігмеяў (негрылі). Паводле тэматычнага класіфікатара Ю. Я. Бярозкіна і Я. М. Дувакіна, першай фіксацыяй матыву падземных карлікаў з’яўляецца надпіс на фасадзе егіпецкай грабніцы XXIII ст. да н. э., больш вядомы як «Ліст Пепі ІІ да Хуфхора». У ім малады фараон загадваў свайму ваенаначальніку даставіць у царскія пакоі пігмея «жывым, цэлым і здаровым для скокаў бога, для забавы» [7, с. 1].

Шэраг даследчыкаў (Я. У. Аляксандрава, Л. Ф. Ваяводскі, І. У. Шталь) адзначалі, што, акрамя прагматычнага выкарыстання пігмеяў у якасці рабоў, старажытныя народы Егіпту ставіліся да іх як да «духаў лесу», якія валодалі сакральнымі скокамі і магічнай сілай. Я. У. Аляксандрава звяртала ўвагу, што «егіпцяне выразна дыферэнцыравалі пігмеяў ад карлікаў. Карлікі маглі мець высокі сацыяльны статус у егіпецкім грамадстве, гралі важную ролю ў культавай практыцы. Бог-карлік Бес з’яўляўся значным міфалагічным персанажам» [8, с. 1].

У пазнейшы час у старажытнагрэцкіх крыніцах («Іліяда» Гамэра, у Герадота, Страбона, Арыстоцеля) вобраз «падземных карлікаў» стаў самастойным матывам. Найбольш вядомыя – міф пра змаганне пігмеяў з жураўлямі, міф пра перамогу Геракла над пачварнымі карлікамі керкопамі, міф аб пакаранні багіней Кібелай дзесяці карлікаў на гары Ідзе, міф пра двух братоў керкопаў.

У старажытнасці замацавалася павер’е, што менавіта падземныя істоты навучылі людзей мастацтву абрабляць металы, пра што сведчыць і тэкст слыннай Парoскай табліцы «Цар Мінос, сын Зеўса, стаў царом Крыта, а фрыгійскія карлікі навучылі грэкаў каваць жалеза» [9, с. 11]. Фрыгійскіх карлікаў называлі дактылямі (ад стараж.-грэч. *δάκτυλος* – «палец»). Вобразы карлікаў з грэцкіх міфаў паступова запазычваліся іншымі культурамі. Можна ўбачыць паралель паміж старажытнагрэцкім дактылем Кельмісам і гномам «Старэйшай Эды» Альвісам, які за свае залёты да дачкі багіні Торы Труд быў ператвораны ў камень.

Адна з першых літаратурных згадак пра маленькіх істот належыць старажытнагерманскаму эпасу «Песня пра Нібялунгаў» (XII–XIII ст.). У ім апісана сварка двух братоў, якія валадарылі падземнымі ахоўнікамі скарбаў нібялунгамі. Яны запрасілі вікінга Зігфрыда арганізаваць падзел іх скарбаў, аднак засталіся незадаволенымі і абвінавацілі апошняга ў сваёй спрэчцы. Абураны Зігфрыд забіў мізэрных братоў і стаў сам валадаром нібялунгаў і іх скарба.

У зборніках «Малодшая Эда» (XII ст.) і «Старэйшая Эда» (XIII ст.), якія змяшчалі скандынаўскія міфы VIII–X ст., у старажытных сагах прысутнічаюць шматлікія згадкі пра карлікаў двергаў і аіфраў, якія лічыліся надзвычай разумнымі, мелі абмежаваныя цудадзейныя здольнасці лекаваць, вырабляць незвычайныя рэчы для асілкаў-багоў. Так, у адным з гераічна-дыдактычных міфаў «Старэйшай Э́ды» апісана гісторыя героя Сігурда, які пазнаёміўся з жыхаром падземнага свету гномам (*dvergar*) Рэгінам. Апошні вырашыў з дапамогай свайго вучня завалодаць сямейным скарбам брата Фафніра, які раней належыў іх бацьку. Сігурд забіў Фафніра, паспрабаваў яго крыві, пасля чаго стаў разумець мову птушак, якія папярэдзілі героя пра будучую здраду гнома. У міфе аб Сігурдзе, які адрубаў галаву свайму кампаньёну і завалодаў скарбам, выяўлена тыповая ідэя скандынаўскіх саг – немінучага пакарання падмана і здрадлівасці.

Міф і архетып маленькай істоты (карліка, гнома, дзіцяці) сталіся зыходнай асновай структураўтваральнай і тропаўтваральнай парадыгмы старажытнай еўрапейскай літаратуры. Пранікненне архетыпу маленькай істоты ў літаратуру невыпадкова. Паводле К. Г. Юнга, ён з’яўляецца адным з асноўных кодаў сусветнай культуры, які культываваўся паралельна антагенэзу чалавецтва і захаваўся на генетычным узроўні ў яго калектыўнай падсвядомасці: «У фальклоры вобразы карліка, эльфа ці маленькага металёвага чалавечка сімвалізуюць таемныя сілы прыроды, яе глыбінныя пачаткі. Гэта падсвядомы аспект калектыўнай душы, характарыстыка яе цэласнасці і самага моцнага жадання кожнай жывой істоты – жадання самарэалізацыі» [10, с. 108]. Архетып маленькіх чалавечкаў, на думку заснавальніка тэорыі псіхааналізу, мог характарызаваць і сферу індывідуальнага падсвядомага, стан псіхікі: «Узнікненне ў свядомасці чалавека шматлікіх ліліпутаў, карлікаў, маленькіх хлопчыкаў без індывідуальных рыс сведчыць, з аднаго боку, аб шызафрэніі,

фрагментацыі асобы, з другога – аб стане несвядомага атаясамлівання сваёй цэласнасці, эга з мноствам групы (сям'і, племені ці нацыі). Калі матыў немаўля ўзнікае ў форме адзінства, мы маем справу з несвядомым і ўжо завершаным сінтэзам асобы» [10, с. 102].

Міф і архетып з часам былі трансфармаваны ў фальклоры, адкуль трапілі ў тэксты дзіцячай літаратуры, для якой характэрная паўтаральнасць матываў: незвычайнае паходжанне героя, незвычайныя здольнасці персанажа, у т. л. здольнасць бачыць тое, што не могуць дарослыя, станоўчы ўчынак ці праяўленне мудрасці героем, нечаканае з'яўленне магутнага заступніка. У падобным фармаце прыгод (затачэнне ў мышалоўцы, праглынанне каровай, вызваленне ад гігантаў, фаварытства караля Артура) смелага хлопчыка памерам з палец бацькі напісана і першая друкаваная англійская фальклорная казка «Гісторыя Тома Пальца» (1621). У 1863 г. гэты тэкст быў адаптаваны Дзінай Марыяй Мюлак для дзяцей, пасля чаго знайшоў творчае артыкуліраваннне ў сусветным фальклоры (чэшскім, беларускім, украінскім, латышскім, сербскім, іспанскім, французскім, нямецкім, чылійскім).

У Сярэднявеччы папулярнасць набылі фейныя казкі з галоўнымі персанажамі феямі (ад англ. *fairy* – «маленькія людзі», «добрыя людзі») – істотамі метафізічнай прыроды, якія валодалі звышнатуральнымі здольнасцямі. Менавіта ў фальклорных казках як калектыўных мастацкіх творах былі сінтэзаваны базальныя сэнсы міфалагемы «маленькія істоты», якая выяўляла актуальныя для пэўных сітуацый модусы светабачання і светаадчування асобы. Зразумела, калектыўныя ўяўленні з часам абнаўляліся, аднак іх структура захоўвала адносную стабільнасць. Важным у архітэктоніцы фальклорных казак заставалася маральная ўстаноўка на адаптацыю рэцыпіентаў да акаляючага прыроднага і сацыяльнага асяроддзя. Па сутнасці, культурна-сэнсавыя палі фальклору выяўлялі ідэю правільных стасункаў асобы і прыроды, сярод якіх адвяргаліся эгаізм, спажывецкасць і паэтызаваліся калектывізм, спагадлівасць, узаемападтрымка. Гэта адлюстравалася і на сэнсавай трактоўцы большасці фейных народных казак (індыйскай казцы «Амір-Алі і Лясная фея», шатландскай казцы «Фея і кацёл», галандскай казцы «Дробненькая фея», турэцкай казцы «Добрае сэрца і цудадзейныя феі»): вобразы міні-персанажаў як прадстаўнікоў прыроднага іншасвету ў іх даюць узор станоўчага ўзаемадзеяння чалавека і сіл прыроды.

Надзвычай пашыранымі фейныя персанажы (як добрыя, так і злыя) былі ў кельтскім і англійскім фальклоры. Напрыклад, асабліва папулярны персанаж англійскіх легенд XIII ст. – сястра караля Артура фея Маргана (Фатамаргана). Вобраз фей быў распаўсюджаным і ў рыцарскіх раманах Ранняга сярэднявечча. З цягам часу вобраз фей пачаў пранікаць у літаратуру і падмяняць класічных німф і сатыраў (У. Шэкспір, В. Скот, Д. Хог). У дзіцячую літаратуру феі прыйшлі з фейных казак для дарослых з шырокай вобразнай палітрай: ад добрых, спагадлівых да злых, помслівых, схільных да крадзяжу дзяцей. Так, у казцы Мары Катрын дэ Ануа «Зялёная змяя» са зборніка «Казкі фей» галоўная гераіня Дораглі пасябравала з пяццю дзесяткамі маленькіх істот памерам з далонь і выглядам падобным на маленькіх кітайскіх лялек. Яны дапамаглі дзяўчыне адчуць сябе прынцэсай: паклапаціліся аб яе знешнім выглядзе, зрабілі дарагія падарункі. У казцы дэ Ануа «Жоўты карлік» злы чалавечак памерам не больш Опа загаду злой феі выкраў прынцэсу, за што быў пакараны добрай феяй пустэлі. Найбольш вядомыя феі дзіцячай літаратуры – хросная з казкі Ш. Пяро, фея з блакітнымі валасамі з «Прыгод Пінокія» К. Калодзі, фея Дзінь-Дзінь з «Пітэра Пэна» Д. М. Бары.

**«Ліліпутства» эпохі Асветніцтва**

Дж. Свіфт у аповесці «Падарожжа Лемюэля Гулівера» (1726) стварыў арыгінальны вобраз маленькіх істот – ліліпутаў – дробных людзей, якія фізічна рэгрэсіравалі з-за сваіх фундаментальных парокаў (эгаістычнасць, ганарлівасць, пыха, крывадушнасць, абман). Гэты твор стаўся сапраўдным адкрыццём у сусветнай літаратуры. У ім адлюстравалася жанрава-стылявая поліфанічнасць (элементы ўтопіі, казкі, навуковай фантастыкі, прыгодніцкай аповесці), багатавектарнасць сатыры на палітычную карупцыю, пыхлівасць навуковых колаў, недалёкасць літаратараў. Свіфт парадыраваў авантурна-маркі раман, падобна як М. Сервантэс у «Дон Кіхоце» і Ф. Рабле ў

«Гарганцюа і Пантагруэле» парадыравалі рыцарскі раман. Вобраз ліліпутаў – пародыя сацыяльных адносін у краіне і дамінавання маленькай Брытаніі над іншымі краінамі. Гратэскна-гіпербалізаванае адлюстраванне нораваў і звычак маленькіх карлікаў стварае камічна-сатырычны эфект. Гратэск у тым ліку дасягаецца і пратакольнай дакладнасцю: ліліпуты знаходзяць 600 цюфякоў для Гулівера, што ў тры разы менш таго, што патрэбна; ліліпуты ў дванаццаць разоў менш за людзей і адносяцца да іх як дзюйм да фунта. Аўтар іранізуе над галоўным героем, крытыкуе яго бядзейнасць, ліслівасць, выхваленне, выказвае адмоўнае стаўленне да яго ліліпутскай псіхалогіі пакорлівасці і захапляецца яго імкненнем стаць самім сабой (назіральным, скептычным, рацыянальным, вольным).

«Гулівер» Дж. Свіфта адыграў велізарную ролю ў папулярызацыі ўвядзення фантастычных элементаў у дыдактычную літаратуру, у ажыўленні жанру казкі-ўтопіі, стаўся трыгерам для наследавання, парадыравання. Менавіта пад уплывам творчасці Дж. Свіфта слынны ірландскі кнігавыдавец Джон Ньюберы заснаваў першае ў свеце перыядычнае выданне для дзяцей «Ліліпут» (1751–1752) – штомесячны часопіс для падлеткаў, у якім на шасцідзесяці старонках змяшчаліся мастацкія і публіцыстычныя творы, навіны і рэдакцыйныя парады. Паказальна, што ў «Ліліпуце» было надрукавана некалькі прыгодніцкіх твораў у стыле знакамітага сатырыка аб падарожжах герояў у мясціны, населеныя дзіўнымі істотамі. Адно з такіх апавяданняў – «Ангеліка» (прыпісваецца розным аўтарам) знаёміла чытачоў з расай драбнюткіх людзей з трыма вачыма, адно з якіх знаходзілася на сярэднім пальцы правай рукі і выкарыстоўвалася для таго, каб засунуць яго субяседніку ў горла і вызначыць узровень яго маральнасці. Піянеры дзіцячай літаратуры другой паловы XVIII ст. выкарыстоўвалі ў сваіх дыдактычных творах фантастычны матыў мікраасобы з прагматычнымі мэтамі выклікаць эпатаж і зацікавіць патэнцыйных пакупцоў падобных выданняў. У выніку на канвенцыйным узроўні вобраз маленькіх істот атрымаў назву «ліліпут».

Спадчына Дж. Свіфта выклікала мноства перайманняў і твораў-працягаў, сярод якіх мастацкім узроўнем вылучаецца кніга англійскага празаіка Т. Х. Уайта «Адпачынак спадарыні Мэшам» (1956). Выяўляючы ідэю аб недапушчальнасці тыраніі і прыніжэння чалавечай годнасці, аўтар гэтага твора падае арыгінальную міметычную канцэпцыю вобразаў ліліпутаў, якія адбудавалі сваю структуру грамадскіх адносін, клапоцяцца аб захаванні сваёй гісторыі і культуры. Дзесяцігадовая сіротка Марыя знаходзіць падчас прагулкі ў сваім радавым маёнтку калонію ліліпутаў, аднак ставіцца да сваіх новых сяброў напачатку па-спажывецку. Аўтарам «Адпачынку спадарыні Мэшам» рэльефна адлюстравана прага ўлады – вар’яцкай, нікчэмнай і ганебнай па сваёй сутнасці. Асэнсаваўшы памылковасць такой пазіцыі, дзяўчынка супрацьстаіць сваім апекунам вікарыю і гувернантцы, якія плануюць завалодаць спадчынным домам Марыі і прадаць маленькіх чалавечкаў у Галівуд. Канфлікт дзяўчынкі са сваімі апекунамі праецыруецца ў канфлікт светапогляда дзяцей са светам дарослых, да якога ў Т. Хайта належаць і ліліпуты, паводзіны і ўчынкі якіх далёкія ад дасканаласці.

Агульная дыдактычная стратэгія дзіцячай літаратуры XVIII ст., эпохі дыдактызму і рэалізму, была скіравана на выхаванне ў маленькага чалавека пачуццяў эмацыйнасці, чуллівасці і аберажэнне чытачоў ад звышнатуральнага. Філосаф Дж. Лок у кнізе «Некаторыя думкі аб выхаванні» (1693) папярэджваў бацькоў і выхавацелей ад апавядання дзецям гісторый пра «духаў і гоблінаў». Ён лічыў, што гісторыі для запалохвання – прэрагатыва сацыяльных нізоў. У гэтай сувязі цікавым літаратурным феноменам падаецца кніга Т. Барэмана «Гіганцкая гісторыя двух славутых гігантаў і іншыя цуды ў Гілдхоле, Лондан» (1740). Першы бізнэсмен у галіне дзіцячага кнігавыдання Т. Барэман не толькі стаў наватарам паліграфіі (увёў афіліраваны кантэнт, прадактплэйсмэнт, публікацыю спісаў падпісчыкаў), але і адным з першых у тэкстах для дзяцей адыйшоў ад дыдактызму, маралізатарства і паставіў на першае месца гумар, займальнасць, спецыфічную манеру апавядання ў стыле «аўтар і чытач – суразмоўцы», які бачны ўжо з прысвячэння «маленькім містэрам і міс».

Такім чынам, матыў маленькіх істот са старажытных міфаў і фальклорных тэкстаў ў XVI ст. пачаў актыўна пранікаць у мастацкую літаратуру. Паступова мініперсанажы (эльфы, гномы, феі, карлікі,

лялькі) актыўна асвойваліся ў дзіцячай літаратуры, трансфармуючы традыцыйныя каноны (вобразныя, сюжэтна-кампазіцыйныя, стылістычныя) жанру казкі. Са зменай стаўлення да феномену дзяцінства адбывалася пераасэнсаванне агульнай дыдактычнай стратэгіі дзіцячай літаратуры, дыдактычнай ролі маленькіх істот у кантэксце літаратурных тэкстаў для юнага пакалення. Аўтарскае наватарства Дж. Базіле, Дж. Свіфта ў раскрыцці матыва маленькіх істот было творча ўспрынята і пераасэнсавана рамантыкамі XIX ст.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Голосовкер, Я. Э. Избранное. Логика мифа / Я. Э. Голосовкер. – М. ; СПб. : Центр гуманитар. инициатив, 2010. – 496 с.

2. Бергсон, А. Два источника морали и религии / А. Бергсон. – М. : Канон, 1994. – 384 с.

3. Balsys, R. Lietuvių ir prūsų dievai, deivės, dvasios: nuo apeigos iki prietaro / R. Balsys. – Klaipėda : Klaipėdos Universiteto Leidykla, 2006. – 445 p.

4. Кошарная, С. А. Миф и язык: Опыт лингво-культурологической реконструкции русской мифологической картины мира / С. А. Кошарная. – Белгород : Белгор. гос. ун-т, 2002. – 287 с.

5. Потебня, А. А. Мысль и язык / А. А. Потебня. – М. : Лабиринт, 2007. – 300 с.

6. Шестеркина, Н. В. Миф как когнитивная парадигма [Электронны рэсурс] / Н. В. Шестеркина. – Рэжым доступу: https://cyberleninka.ru/article/n/mif-kak-kognitivnaya-paradigma. – Дата доступу: 12.09.2023.

7. Пиопи II. Википедия. Свободная энциклопедия [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://ru.wikipedia.org/wiki/Пиопи_II. – Дата доступу: 12.09.2023.

8. Александрова, Е. В. «Подземные карлики» в Египте: между историей и мифом [Электронны рэсурс]. / Е. В. Александрова. – Рэжым доступу: https://cyberleninka.ru/article/n/-podzemnye-karliki-v-egipte-mezhdu-istoriey-i-mifom). – Дата доступу: 12.09.2023.

9. Гаспаров, М. Л. Занимательная Греция. Рассказы о древнегреческой культуре / М. Л. Гаспаров. – М. : Новое лит. обозрение, 2000. – 384 с.

10. Юнг, К. Г. Душа и миф: шесть архетипов : пер. с англ. / К. Г. Юнг. – Киев : Гос. б-ка Украины для юношества, 1996. – 384 с.

## REFERENCES

1. Golosovkier, Ya. E. Izbrannoje. Logika mifa / Ya. E. Golosovkier. – M. ; SPb. : Centr gumanitar. iniciativ, 2010. – 496 s.

2. Biergson, A. Dva istochnika morali i rieligii / A. Biergson. – M. : Kanon, 1994. – 384 s.

3. Balsys, R. Lietuvių ir prūsų dievai, deivės, dvasios: nuo apeigos iki prietaro / R. Balsys. – Klaipėda : Klaipėdos Universiteto Leidykla, 2006. – 445 p.

4. Kosharnaja, S. A. Mif i jazyk: Opyt lingvo-kuljturologichieskoj riekonstrukcii russkoj mifologichieskoj kartiny mira / S. A. Kosharnaja. – Bielgorod : Bielgor. gos. un-t, 2002. – 287 s.

5. Potebnia, A. A. Myslj i jazyk / A. A. Potebnia. – M. : Labirint, 2007. – 300 s.

6. Shestiorkina, N. V. Mif kak kognitivnaja paradigma [Eliektronny resurs] / N. V. Shestiorkina. – Rezhym dostupu: https://cyberleninka.ru/article/n/mif-kak-kognitivnaya-paradigma. – Data dostupu: 12.09.2023.

7. Piopi II. Vikipiedija. Svobodnaja enciklopiedija [Eliektronny resurs]. – Rezhym dostupu: https://ru.wikipedia.org/wiki/Piopi_II. – Data dostupu: 12.09.2023.

8. Alieksandrova, Ye. V. «Podziemnyje karliki» v Jegiptie: miezhdu istorijej i mifom [Eliektronny resurs] / Ye. V. Alieksandrova. – Rezhym dostupu: https://cyberleninka.ru/article/n/-podzemnye-karliki-v-egipte-mezhdu-istoriey-i-mifom). – Data dostupu: 12.09.2023.

9. Gasparov, M. L. Zanimatiel’naja Griecija. Rasskazy o drievniegriechieskoj kul’turie / M. L. Gasparov. – M. : Novoje lit. obozrienije, 2000. – 384 s.

10. Yung, K. G. Dusha i mif: shest’ arkhietipov : pier. s angl. / K. G. Yung. – Kijev : Gos. b-ka Ukrainy dlia junoshestva, 1996. – 384 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 07.12.2023*